УДК 947.6 “1668/1772” + [ [ 2+261.7] (476)+327 (47+57:430) ] (091) “1668/1772”

***Н.А. ПОЛЯК***

# БАРАЦЬБА ЗА МАГІЛЁЎСКУЮ (БЕЛАРУСКУЮ) ЕПАРХІЮ (1686 – 1772 гг.)

*Адной са знакавых падзей для дысідэнцкага пытання як аб’екта міжнароднай палітыкі з пачатку XVIII ст. была барацьба за Магілёўскую праваслаўную кафедру, якая разгарнулася паміж каталікамі, уніятамі і праваслаўнымі ў пачатку XVIII ст. Змаганне за валоданне праваслаўнай кафедрай у Магілёве было спецыфічнай рысай дысідэнцкага пытання ўсёй Рэчы Паспалітай і падкрэслівала важнае значэнне ў ім беларускага фактару. Практыка прызначэння беларускіх епіскапаў са згоды Маскоўскага патрыярхата (з 1707 г.), стварэнне пасады расійскага камісара ў Магілёве (з 1710 г.) і ўмяшанне кіеўскага мітрапаліта ў справы Беларускай епархіі выклікалі супраціўленне духоўных і свецкіх улад Рэчы Паспалітай і ВКЛ. Падпарадкаванне апошняй у польска- літоўскай дзяржаве праваслаўнай епархіі ўладзе ўсходняга суседа было прычынай уключэння ў барацьбу вакол Магілёва вышэйшай каталіцкай духоўнай улады – апостальскай сталіцы. Абвастрэнне і асаблівае значэнне гэтай барацьбы ў канцы XVIII ст. звязана з асобай Георгія Каніскага, дзейнасць якога ўплывала на далейшае развіццё дысідэнцкага пытання і на спосабы яго вырашэння.*

### *Уводзіны*

Даследаванню канфесійных адносін і значэнню іх ў міжнароднай палітыцы ў канцы XVII – XVIII ст. прысвечана дастатковая колькасць літаратуры. Але замежныя і айчынныя гісторыкі абміналі пытанне аб выключным значэнні барацьбы за Магілёўскую праваслаўную епархію для развіцця дысідэнцкага пытання.

Для асвятлення пазначанай у артыкуле тэматыкі былі выкарыстаны працы В.А. Бяднова [1] і І. Чыстовіча [2]. У напісаных яшчэ ў XIX ст. даследаваннях узнята праблема праваслаўных дысідэнтаў Рэчы Паспалітай і ВКЛ і вызначана іх месца ў тагачасным грамадскім і палітычным жыцці. Ролю вызваленцаў і барацьбітоў за правы прыгнечаных аднаверных аўтары адводзілі расійскім манархам, а асноўныя пакуты вернікаў грэка-рускай царквы звязваюць з каталікамі і уніятамі.

Творы польскіх навукоўцаў пачатку XX ст. (Ё. Фельдман [3] і Я. Волінскі [4]) дазваляюць дакладна зразумець прычыны вострага непрыняцця духоўнымі і

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

свецкімі ўладамі Рэчы Паспалітай і ВКЛ пратэктарскай палітыкі Расійскай дзяржавы ў дачыненні вернікаў Беларускай епархіі.

Асобна можа вылучыць працу беластоцкага даследчыка А. Мірановіча "Diecezja białoruska w latach 1697 – 1772" [5]. У артыкуле А. Міровіч спыняецца на асобах беларускіх епікапаў, апісвае іх адносіны з кіеўскімі мітрапалітамі і расійскай свецкай і духоўнай уладай. Каштоўнымі ў даследаванні з'яўляюцца статыстычныя дадзеныя, якія прадстаўляюць інфармацыю аб колькасці прыходаў і манастыроў Магілёўскай епархіі.

У працы праваслаўнага святара М. Буглакова "Преосвященный Георгий Конисский, архиепископ Могилевский" [6], значная частка якой прысвечана Святому Георгію, даказваецца, што Магілёў, як і ўся праваслаўная Беларусь, быў асноўным тэатрам рыма-каталіцкай інтэрвенцыі. Магілёўсая кафедра мела выключны ўплыў на лёс заходнерускага праваслаўя. Даследчыкам выкарыстана вялікая колькасць крыніц з архівасховішчаў Расіі, Польшчы, Літвы, якія дапаўняюць ужо існуючую базу крыніц па тэме.

Крыніцы па дадзенай тэматыцы ў дастаткова поўным аб'ёме прадстаўлены ў дакументальных зборах, якія былі выдадзены ў канцы XIX ст. [7, 8, 9]. На падставе прыведзеных там скарг і прашэнняў аб дапамозе, напісаных беларускімі духоўнымі асобамі да аднаверных манархаў, можна даведацца аб складаных матэрыяльных, ідэалагічных і арганізацыйных умовах жыцця праваслаўных вернікаў на беларускіх землях, а таксама высветліць, якія метады вырашэння гэтых праблем існавалі ў той час.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца спроба вызначыць ролю падзей вакол Магілёўскай епархіі ў міжнародных адносінах дзяржаў усходне- і цэнтральнаеўрапейскага рэгіёну і паказаць значэнне барацьбы за існаванне Магілёўскай (Беларускай) кафедры для міжканфесійных стасункаў у канцы XVII – XVIII ст.

### *Асноўная частка*

Міжнародная сітуацыя другой паловы XVII ст. ва ўсходне- і цэнтральна-еўрапейскім рэгіёне характарызавалася грунтоўным пераразмеркаваннем палітычных сіл. Значны ўплыў на тагачасныя міжнародныя працэсы аказвалі адносіны паміж царквамі. Нягледзячы на падпісаны паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай дзяржавай "вечны мір" (1686 г.), IX артыкул якога гарантаваў раўнапраўе праваслаўнаму насельніцтву польска-літоўскай дзяржавы, праваслаўная канфесія атрымала статус дысідэнцкай таму, што палітычныя і рэлігійныя правы яе вернікаў у значнай ступені абмяжоўваліся. Такое становішча праваслаўных захоўвалася амаль да першага падзелу Рэчы Паспалітай.

Напачатку XVIII ст. на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай і ВКЛ засталася толькі адна праваслаўная епархія – Магілёўская (Беларуская). Тры астатнія (Луцкая, Пярэмышльская, Львоўская) прынялі унію. Паступова адышло ў нябыт казацтва, якое доўгі час выступала ўнутранай абарончай сілай праваслаўя. Вычарпалі свае рэзервы праваслаўныя брацтвы і шляхта. Рэлігійна-веравызнаўчая сітуацыя склалася тут не на карысць праваслаўя.

Такім чынам, амаль з моманта падпісання "вечнага міру" ўсё, што тычылася праваслаўных, было звязана з Магілёўскай кафедрай. Вакол кафедры разгарнулася зацятая барацьба, удзел у якой прымалі прадстаўнікі іншых канфесій (католікі і уніяты), мясцовыя і замежныя духоўныя асобы, свецкія айчынныя і іншаземныя ўлады.

Беларуская епархія пасля смерці Тэадора Васілевіча (Магілёўскі епіскап з 1669 па 1678 гг.) амаль 20 гадоў заставалася без кіраўніка. Вакантнае месца было занята адразу пасля прыезду ў Варшаву пасла Пятра I Аляксея Нікіціна.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

На пасаду магілёўскага епіскапа прызначылі Серапіёна Палхоўскага (1697 – 1704). Упарадкаванне спраў, звязаных з асобай беларускага епіскапа і яго кафедрай, не спыніла павелічэння уніі і не выправіла канфесійныя непаразуменні ў дзяржаве [5, с. 79].

Відавочны рост уніяцкага насельніцтва і ліхалецці Паўночнай вайны адмоўна ўплывалі на стан Магілёўскай праваслаўнай кафедры. Рэальнага паляпшэння не мог прынесці праваслаўным каралеўскі універсал 1705 г. і ўладкаванне на зноў асірацелую Магілёўскую епархію Сільвестра Чацвярцінскага (1707 – 1729). Пад націскам расійскай дыпламытыі ён набыў тытул "епіскапа ўсёй Белай Русі, мсціслаўскага, аршанскага, магілёўскага і намесніка (кіеўскага) мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага" [5, с. 81]. Такі тытул больш адпавядаў амбіцыям біскупа, чым сапраўднай яго ўладзе. Пад юрысдыкцыю Чацвярцінскага падпадалі магілёўска-мсціслаўскія прыходы, іншыя праваслаўныя асяродкі тэрыторый Беларусі (у Вільні, Беластоку, Пінску, Мінску, Слуцку і інш.) знаходзіліся пад уладай кіеўскага мітрапаліта. У студзені 1710 г. на адрас Пятра І прыйшла чалабітная ад ігуменаў Куцеенскага, Буйніцкага і Мсціслаўскага праваслаўных манастыроў з просьбай абараніць ад прыцісканняў з боку беларускага епіскапа С. Чацвярцінскага [8, с. 44]. Ужо ў лютым 1710 г. Пётр І выдаў загад накіраваць у Магілёў у якасці камісара стольніка Багуслава Якаўлевіча Шыпнеўскага для назірання за беларускім епіскапам. Улада С. Чацвярцінскага не была афіцыйна пацверджана прывілеем караля Рэчы Паспалітай, што адмоўна ўплывала на яго асабісты стан і статус праваслаўнай царквы ў дзяржаве [1, с. 124].

Магілёўскі епіскап намагаўся аб'яднаць пад сваёй уладай усе праваслаўныя прыходы і манастыры беларускіх зямель. У найбольшай ступені яго цікавіла Слуцкая архімандрыя з манастыром Святой Троіцы і стаўрапігальным брацтвам як адзін з моцных праваслаўных асяродкаў [7, с. 150]. Такія дзеянні епіскапа былі ацэнены Масквой і кіеўскім мітрапалітам як агрэсія. Кіеўскі мітрапаліт забараніў ужываць у дачыненні да Чацвярцінскага тытул генеральнага намесніка ВКЛ.

Канфлікты беларускага епіскапа з кіеўскім мітрапалітам і з праваслаўным духавенствам беларускіх зямель спрыялі распаўсюджванню уніі і заняпаду праваслаўя. Не мела станоўчых вынікаў ратыфікацыя на сойме 1710 г. IX артыкула "вечнага міру", які гарантаваў беларускім праваслаўным прававую роўнасць з іншымі канфесіямі. Доўгачаканае канстытуцыйнае афармленне толькі "адчыніла вароты Пятру для больш смелага і глыбокага ўтручэння ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай" [4, с. 112] і дэманстравала, што ўнутраныя справы польска-літоўскай дзяржавы цяпер вырашаюцца за ўсходняй мяжой.

У 1716 г. з'явіўся праект знішчэння іншаверцаў ва ўсёй Рэчы Паспалітай і ВКЛ. На сойме 1717 г. было агучана, што "Рэч Паспалітая можа быць моцнай толькі тады, калі ў краіне будзе дамінаваць адно веравызнанне. З гэтай нагоды неабходна знішчыць не толькі праваслаўе, але і уніяцтва" [3, с. 19]. Расійскі пасол у Варшаве Г.Ф. Далгарукі даў згоду на замацаванне канстытуцыяй агучанай антыдысідэнцкай пастановы, што паставіла іншавернае насельніцтва ў больш складаныя ўмовы і ў некаторай ступені падарвала аўтарытэт Расійскай дзяржавы як галоўнага апекуна праваслаўных у свеце.

На адрас расійскага манарха з беларускіх і літоўскіх манастыроў працягвалі ўвесь час прыходзіць скаргі з просьбамі ўзяць пад ахову аднаверных. У 1720 г. С. Чацвярцінскі прасіў Пятра І забяспечыць свабоду адпраўлення набажэнстваў, магчымасць праваслаўным займаць магістрацкія пасады, вярнуць перайшоўшыя на унію цэрквы і манастыры (з 1715 па 1720 гг. каля 75 цэркваў), дазволіць праваслаўным духоўным асобам прымаць удзел у сенаце [9, с. 117].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Урэшце імператар Пётр заняў больш радыкальную пазіцыю і даручыў расійскаму паслу ў Варшаве Г.Ф. Далгарукаму і ваяводзе мазавецкаму Халентоўскаму скласці дакладнае паведамленне польскаму каралю аб рэлігійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай і аб цяжкім становішчы праваслаўных. У адказ на паведамленне 28 лістапада 1720 г. Аўгуст II выдаў Магілёўскай епархіі прывілей. Прапаноўвалася таксама стварыць пасады камісараў для разбору рэлігійных канфліктаў. Заняць пасаду ў 1722 г. з расійскага боку было даручана Ігнату Рудакоўскаму, перакладчыку пры рускім пасольстве ў Варшаве. Польскі бок прапанову падтрымаў, але выкананне яе замаруджвалася. Польскага камісара ў Магілёў даслалі значна пазней [2, с. 56]. Асноўнай мэтай працы І. Рудакоўскага было даследаванне крыўд і свавольстваў уніятаў, прадстаўленне доказаў уціску праваслаўных і вяртанне ўсіх адабраных культавых устаноў.

Рудакоўскі працаваў у Магілёве ўсяго 3 гады. За гэты кароткі тэрмін у праваслаўе было вернута 50 цэркваў і 3 манастыры. Камісар упэўніваў, што падтрымліваць праваслаўных у гэтым рэгіёне неабходна, гэта дыктуецца дзяржаўнымі інтарэсамі, бо, адступіўшы ад гэтай веры, мільён чалавек могуць стаць ворагамі Расійскай імперыі. Уніятаў неабходна трымаць на ланцугу і не дазваляць разрастацца іх вольнасцям [10, с. 16].

Перагляд метадаў падтрымкі аднаверных у польска-літоўскай дзяржаве пасля смерці Пятра І вымусіў расійскія кіруючыя колы адазваць з Магілёва камісара І. Рудакоўскага. Гэта, разам са смерцю С. Чацвярцінскага (1728 г.), выклікала чарговую хвалю вострай барацьбы за валоданне Магілёўскай кафедрай. На думку даследчыка Булгакова М., умяшанне ў справы Беларускай кафедры кіеўскага мітрапаліта і рускіх епіскапаў на фоне працяглых канфліктаў з Магілёўскім брацтвам і іншым праваслаўным духавенствам Беларусі, канчаткова падарвалі сілы кафедры і справакавалі барацьбу за яе [6, с. 40].

Удзельнікамі чарговага канфлікту вакол Магілёва напрыканцы 20-х гг. сталі уніяцкі мітрапаліт Афанасій Шыптыцкі, які выступаў за перадачу кафедры уніятам, апостальская сталіца і Расійская дзяржава. Папа Бенедыкт III падтрымаў ідэю перадачы кафедры Полацкаму уніяцкаму архіепіскапу. Расійская дзяржава, каб захаваць свае пазіцыі ў гэтым праваслаўным рэгіёне, прапанавала на пасаду беларускага епіскапа Арсенія Берло, але новы кандыдат не мог разлічваць на зацвярджальны прывілей караля Аўгуста II. Дзякуючы намаганням папскага нунцыя ў Рэчы Паспалітай Каміла Мерліні (1728 – 1738) уніяты атрымалі сваю кафедру ў Магілёве (1731 г.), а епіскапу Арсенію прадпісвалася выконваць толькі духоўныя абавязкі і не ўмешвацца ў іншыя справы кафедры.

Становішча ўсяго іншавернага (праваслаўных і пратэстантаў) насельніцтва беларускіх зямель ВКЛ ускладнілася падчас бескаралеўя напачатку 30-х гг. XVIII ст. На сойме Рэчы Паспалітай у 1733 г. былі зацверджаны чарговыя абмежаванні палітычных і рэлігійных свабод для дысідэнтаў. Праваслаўныя і пратэстанты былі выкарыстаны для ўзвядзення на трон Рэчы Паспалітай Аўгуста III Саса. Пад ціскам расійскіх дыпламатаў новая ўлада выканала толькі адно з абяцаных ім паслабленняў – у 1734 г. зацвердзіла на Магілёўскую кафедру чарговага епіскапа. Іосіф Валчанскі (рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі з 1721 г.) уключыўся ў змаганне за правы беларускіх праваслаўных і асноўныя свае спадзяванні звязваў з аднавернай дзяржавай з усходу. Епіскап Іосіф Валчанскі некалькі разоў звяртаўся да Свяцейшага Сіноду з просьбамі аб матэрыяльнай і ідэалагічнай дапамозе, але не заўжды знаходзіў там паразуменне. Справу вяртання праваслаўных святынь на беларускіх землях працягнуў прызначаны на Магілёўскую кафедру Геранім Валчанскі, які не аднойчы з просьбамі аб дапамозе звяртаўся да Сіноду, Калегіі замежных спраў і імператрыцы (1745, 1747,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

1751 гг.). Апека з боку аднавернай дзяржавы абмяжоўвалася прадпісаннямі расійскаму паслу і рэзідэнту дамагацца спынення ціску праваслаўных і не больш таго. На гэты конт слушнай з'яўляецца заўвага сучаснага расійскага даследчыка Ціханава А., які лічыць, што да падзелаў Рэчы Паспалітай расійскія ўлады абмяжоўваліся толькі знешнім наглядам за насельніцтвам тэрыторыі Беларусі [11, с. 142].

У 1745 г. у чарговы раз паўстала пытанне аб існаванні або неіснаванні Магілёўскай епархіі як праваслаўнай. Сымон Грыневіч плебан з Оршы намагаўся перавесці кафедру на унію. "Хачу быць другім Іасафатам. Я на тое і вызначаны тут, і не спынюся, пакуль Магілёў Вітэбскам не зраблю і на унію не ператвару" [6, с. 52]. У 1747 г. да барацьбы далучыўся полацкі уніяцкі архіепіскап Фларыян Грэбніцкі, які з прапановай ліквідаваць праваслаўную епархію і абараніць ад наступу "схізматыкаў" звярнуўся да віленскага каад'ютара Сапегі [7, с. 184]. Геранім вымушаны быў накіраваць сваю скаргу ў Галоўны Трыбунал ВКЛ, дзякуючы чаму супрацьстаянне прыпынілася.

Адной з магчымасцей для праваслаўнага духавенства заявіць аб сваіх правах магла стаць створаная аб'яднаная камісія па разгляду скарг. Але Г. Валчанскі і духоўныя асобы манастыроў і брацтваў Слуцка, Вільні, Пінска і іншых цэнтраў праваслаўя ігнаравалі яе. Камісія пасля першай жа сустрэчы яе членаў была зачынена.

Асаблівае значэнне барацьбы вокол Магілёўскай епархіі ў канцы XVIII ст. звязана з асобай Георгія Каніскага. У 1755 г. пасля смерці Гераніма Валчанскага Папа Рымскі патрабаваў ад Аўгуста III скасаваць праваслаўную епархію. Расійская імператрыца Елізавета (1741 – 1762) перахапіла ініцыятыву і дамаглася зацвярджэння ў Магілёве рэктара кіеўскай акадэміі Георгія Каніскага (1755 – 1785). Г. Каніскі распачаў актыўную дзейнасць па ўпарадкаванні сваёй паствы. Уласнае бачанне Г. Каніскім праблемы роўнасці правоў беларускіх праваслаўных сталі асновай новай дысідэнцкай палітыкі Расіі, Прусіі і Рэчы Паспалітай. Рэалізацыя гэтай новай палітыкі расійскай імператрыцай Кацярынай II прывяла да карэнных змен на палітычнай карце Еўропы.

Нягледзячы на тое што на працягу XVIII ст. унію прынялі шмат праваслаўных прыходаў, найбольшая іх колькасць заставалася на тэрыторыі Беларусі і яе этнічных землях. Такая ж тэндэнцыя назіралася і ў дачыненні пратэстанцкага насельніцтва. Манавіта ў ВКЛ і на беларускіх землях колькасць кальвінскіх збораў перавышала іх колькасць у Кароне. Такая канфесійная сітуацыя была абумоўлена існуючым у ВКЛ заканадаўствам і традыцыямі веравызнаўчых адносін. Беларуская епархія напярэдадні першага падзелу Рэчы Паспалітай налічвала 267 прыходаў: у ваяводствах Мсціслаўскім – 115, Віцебскім – 109, Полацкім – 42, Мінскім – 1. Рэлігійнае жыццё ў іх праходзіла вакол Невельскага, Полацкага, Мсціслаўскага, Тупічаўскага, Куцеінскага, Шклоўскага, Аршанскага, Магілёўскага, Віцебскага і іншых манастыроў [5, с. 90].

***Заключэнне***

Існаванне або неіснаванне Магілёўскай епархіі для духоўных і свецкіх колаў Рэчы Паспалітай і ВКЛ было прынцыповым пытаннем. З ліквідацыяй апошняй праваслаўнай кафедры свецкія ўлады Рэчы Паспалітай звязвалі рэальную магчымасць скасаваць галоўную зачэпку для ўмяшання замежных краін ва ўнутрыпалітычнае жыццё сваёй айчыны. Палітыка апекі над сваімі аднавернымі Расійскай дзяржавы і Прусіі супярэчыла даўнім традыцыям шляхецкай вольнасці і дэмакратычнаму ладу Рэчы Паспалітай [12, с. 116]. Згодна з эклезіалагічным

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

падыходам трактоўкі гістарычных падзей, для каталіцкага і уніяцкага духавенства праваслаўе было вераадступніцтвам або схізмай, з якой неабходна змагацца. Гэтыя фактары і выклікалі вострую барацьбу вакол апошняй у Рэчы Паспалітай і ВКЛ праваслаўнай Магілёўскай (Беларускай) епархіі.

Такім чынам, цэнтрам канфесійна-рэлігійнага жыцця беларускіх зямель больш чым стагоддзе з'яўляўся Магілёў. Распачатая ў ім барацьба за валоданне праваслаўнай кафедрай прыцягвала погляды ўсяго тагачаснага міжнароднага грамадства. У адзначаны прамежак часу рэлігійнае спаборніцтва ўсё часцей атаясамлівалася з палітычным і перамога ў ім была прынцыповым пытаннем для свецкіх і духоўных колаў Рэчы Паспалітай, Вялікага княства Літоўскага і Расійскай дзяржавы.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Беднов, В.А.*** Православная церковь в Польше и Литве / В.А. Беднов. – Мн.: Лучи Софии, 2002. – 430 с.
2. ***Чистович, И.А.*** Очерк истории западно-русской церкви / И.А. Чистович. – СПб.: Тип. Депортамента уделов, 1882. – Ч. 1. – 220 с.
3. ***Feldman, Józef.*** Czasy Saskie. Wybór ż ródeł / Józef Feldman. – Kraków, Nakładem krakowskiej spűłki wydawniczej, 1928. – 256 s.
4. ***Woliński, Janusz.*** Polska i Kościoł prawosławny. Zarys historyczny / Janusz Woliński. – Lwów: wyd. zakładu narodowego im. Ossolińskich, 1936.—150 s.
5. ***Miranowicz, A.*** Diecezja białoruska w latach 1697 – 1772 / A. Miranowicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2003. – № 19. – S. 77-96.
6. ***Буглаков, М.*** Священник. Преосвященный Георгий Кониский, архиепископ Могилевский / М. Буглаков. – Мн.: Виновград, 2000. – 653 с.
7. Археологический сборник документов, относящихся к истории северо-западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа, собранный в Несвиже и изданный П. Гильгебрандтом и А. Миротворцевым. – Вильня, 1870. – Т. 7. – 342 с.
8. Памятники православия и русской народности в Западной России в XVII – XVIII вв. / под ред. Ф. Титова. – Киев: тип. И.И. Чоколова, 1905. – Т. 1. – Ч. 2. – 1137 с.
9. Сборник документов, уясняющих отношения латино-польской пропоганды к русской вере и народности. – Вып. 2. – Вильна, 1866. – 281 с.
10. ***Марозава, С.В.*** Пётр I на абароне сваіх адзінаверцаў на Беларусі / С.В. Марозава // Приграничное и региональное сотрудничество: новые задачи и пути решения. – Витебск, 1998. – С. 16-19.
11. ***Тихонов, А.К.*** Власти и католическое население России в XVIII – XIX вв. / А.К. Тихонов // Вопросы истории. – 2004. – №3. – С. 140 – 146.
12. ***Konarski, S.*** Wybór pism politycznycg./opr. Władysław Konopczyński / S. Konarski. – Kraków: Krakowska spółka wydawnicza, 1921. – 329 s.


Паступіў у рэдакцыю 20.09.2005.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова